*А.У. Скакоўская,*
*старшы выкладчык кафедры*
*рускай мовы як замежнай*
*Беларускага дзяржаўнага*
*ўніверсітэта культуры і мастацтваў*

# КАНТЭКСТУАЛЬНАЕ ФАРМІРАВАННЕ ФІЛАЛАГІЧНАЙ КУЛЬТУРЫ ЯК ФАКТАРУ ДУХОЎНАСЦІ АСОБЫ

Нацыя пачынаецца з ведання і захавання ўласнай гісторыі, з адносін да спадчыны, перададзенай продкамі, з граматнага карыстання роднай мовай. Фундаментам любой нацыі з'яўляецца культура ва ўсіх яе шматгранных праявах.

Іерархічная «лесвіца» ўзыходжання чалавека да ўсё больш высокіх вынікаў, у адпаведнасці з тэорыяй Б. С. Гершунскага, уяўляе наступную мадэль: граматнасць – адукаванасць – прафесійная кампетэнтнасць – культура – менталітэт [4, с. 59–66]. Як бачым, менавіта менталітэт і культура займаюць іерархічна вышэйшыя ступені, прадвызначаючы змест усіх іншых звенняў, і ўвасабляюць глыбінныя асновы светаўспрымання, светапогляду. Таму ў адукацыі, якая пачынаецца з маленства, павінна перш за ўсё фарміравацца ўласная актыўнасць асобы, патрэба ў супрацоўніцтве і дыялогу, развіцці цікавасці да гуманітарнай культуры, стварэнні духоўных каштоўнасцей, убачаных з нацыянальнага пункту гледжання. Такі падыход спрыяе ў перспектыве ўдасканаленню найважнейшых жыццёвых сфер грамадства, дзяржаўнасці, а значыць, стварае трывалую нацыянальную аснову, што дае магчымасць паўнапраўнага і шматаспектнага партнёрства ў еўрапейскай і сусветнай супольнасці, забяспечвае павагу да нацыянальнага суверэнітэту.

Амерыканскі псіхолаг Дж. Брунэр, разважаючы пра асаблівасці сістэмы адукацыі, ужывае паняцце *кантэкст дзеяння.* На яго думку, грамадства павінна прывесці выкладаемы матэрыял (сістэму ўяўленняў або звязную сістэму ведаў) да формы, прыдатнай да авалодання, абавязана надаваць вялікую ўвагу таму, наколькі гэты матэрыял можа служыць кіраўніцтвам да дзеяння, прапаноўваць навучанне ў кантэксце жыцця і дзеяння, забяспечыць у поўнай захаванасці перадачу ад пакалення да пакалення ўсіх жыццёва неабходных навыкаў і аперацый [2, с. 382–383].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Адна з найважнейшых ідэй сучаснай адукацыі – творчае (індывідуальнае), свабоднае, праз выбар, паглыбленне ў гуманітарную культуру. Гуманітарызацыя адукацыі азначае зварот да духоўных каштоўнасцей, гэта «працэс фарміравання духоўнага свету чалавека праз культурны вопыт стварэння і асваення каштоўнасцей, які можна вызначыць як гуманітарную творчасць, што ўключае ў сябе мастацка-эстэтычную і духоўную накіраванасць суб’екта» [5, с. 30]. Гэта павінна адлюстравацца перш за ўсё ва ўзмацненні гуманітарнай складаемай, асабліва філалагічных дысцыплін. Улічваючы спецыфіку філалогіі як сукупнасці навук, што вывучаюць культуру народа, выражаную ў мове і літаратурнай творчасці, мэта філалагічнай адукацыі – узбагачэнне сістэматычнымі спецыяльнымі ведамі, фарміраванне практычных навыкаў і першапачатковых уменняў. Перш за ўсё, гэта праца над тэкстам, бо першааснову складае менавіта тэкст, а ў ім, у сваю чаргу, самае галоўнае – слова ў кантэкстуальным значэнні. Філалогія «ўбірае ў свой кругагляд усю шырыню і глыбіню чалавечага быцця, перш за ўсё быцця духоўнага, служыць самапазнанню культуры». Яна дапамагае зразумець чалавека іншага менталітэту і праз гэта – іншую культуру, іншую прастору і час. Прадмет філалогіі – «увесь чалавечы свет, але свет арганізаваны і ўбачаны праз тэкст» [6].

Такім чынам, філалагічная культура – далучэнне да сацыяльна-гістарычных дасягненняў праз мову і літаратурную творчасць.

Чым больш знаходзіцца чалавек у асобасным дыялогу з культурай, тым больш удасканальваюцца яго ўласныя каштоўнасныя арыентацыі, шліфуецца яго светапогляд. Па справядлівым меркаванні расійскага педагога-метадыста Л. С. Айзермана, «культурай нельга “авалодаць” <…>. “Вывучаная культура” не становіцца прасторай нашага свабоднага дыхання…» [1, с. 28].

Па-сапраўднаму адукаваны і культурны чалавек – той, хто можа разумець літаратурны твор (тэкст), бачыць яго мастацкія асаблівасці і агульныя сувязі з іншымі творамі і жыццёвымі калізіямі.

Вылучым асноўныя этапы, на працягу якіх фарміруюцца філалагічная культура і кантэкстуальная кампетэнтнасць.

*Першы этап* – пазнанне чытачамі свету і чалавека праз мастацкае іх адлюстраванне і маральна-эстэтычную ацэнку. Яго задачы:

1) зацікавіць чытаннем, навучыць успрымаць літаратуру як мастацтва слова;

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

2) сфарміраваць у чытачоў уяўленне пра тэматычнае падабенства некаторых твораў і навучыць самастойна знаходзіць названую асаблівасць.

*Другі этап* накіраваны на фарміраванне шматграннай асобы праз разуменне чытачамі спецыфікі літаратуры, развіццё кантэкстуальнай кампетэнтнасці. Ён прадугледжвае адпаведныя задачы:

1) пашыраць у чытачоў іх чалавеказнаўчыя, жыццёвыя і эмацыянальна-вобразныя ўяўленні праз спасціжэнне агульнага прынцыпу ўладкавання Сусвету (асоба – яе род – нацыя – Радзіма – свет) і яго мастацка-эстэтычнага адлюстравання;

2) развіваць каштоўнасныя арыентацыі праз параўнальны прынцып падачы вучэбнага матэрыялу (супастаўленне блізкіх па праблематыцы твораў у межах творчасці пэўнага аўтара, пісьменнікаў айчыннай і сусветнай літаратуры), суаднясенне літаратуры з іншымі відамі мастацтва, публіцыстыкай і гуманітарнымі навукамі (гісторыяй).

На *трэцім этапе* актыўна фарміруюцца ўласная сістэма каштоўнасных арыентацый, імкненне да самаактуалізацыі. Задачы яго:

1) фарміраваць кантэкстуальны тып мыслення;

2) арыентаваць на ўспрыманне літаратуры як цэласнай мастацкаэстэтычнай з’явы; дапамагчы асэнсаваць ідэйна-мастацкі змест твораў айчыннай і сусветнай літаратуры з нацыянальнай і агульначалавечай пазіцыі.

На гэтым этапе прадугледжваецца праца па актуалізацыі, паглыбленні і сістэматызацыі ведаў і ўменняў, атрыманых на папярэдніх ступенях навучання. Фарміруецца ўяўленне пра тое, што літаратура з’яўляецца вынікам развіцця нацыянальнай, грамадзянскай і эстэтычнай свядомасці, культурнай дзейнасці. Абапіраючыся на веды, атрыманыя па рускай літаратуры, гісторыі Беларусі, сусветнай гісторыі, сусветнай мастацкай культуры, і ў працэсе самастойнага чытання, варта фарміраваць уяўленне аб гістарычным працэсе ў чалавеказнаўстве. Гісторыка-параўнальнае вывучэнне літаратуры дае магчымасць бачыць з’явы роднай літаратуры ў агульналітаратурным кантэксце і абуджае цікавасць як да айчыннай, так і да агульначалавечай культуры.

Такі падыход дапамагае развіваць мысленне, актывізуе творчыя здольнасці, фарміруе чытацкі густ, абуджае патрэбу ў паглыбленай інтэлектуальнай дзейнасці, а значыць, садзейнічае выхаванню асобы «з выразна выяўленымі творчымі схільнасцямі, здатнай… эстэтычнае ўспрыманнеператварыць у пажыццёвы стымул

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

маральнага самаўдасканалення, інтэлектуальнага і духоўнага развіцця» [3, с. 4].

---


1. *Айзерман, Л.* Пятьдесят лет спустя. Статья первая / Л. Айзерман // Литература в школе. – 2006. – № 9. – С. 25–28.

2. *Брунер, Дж.* Психология познания / Дж. Брунер. – М. : Прогресс, 1977. – 412 с.

3. *Вучэбная* праграма для агульнаадукацыйных устаноў з беларускай і рускай мовамі навучання. Беларуская літаратура : V–XI класы / Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь. – Мінск : НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі», 2008. – 152 с.

4. *Гершунский, Б. С.* Философия образования / Б. С. Гершунский. – М. : Моск. психолого-социальный ин-т : Флинта, 1998. – 432 с.

5. *Печенко, М. Ф.* Литература в гуманитарном образовании / М. Ф. Печенко // Актуальныя праблемы літаратурнай адукацыі на сучасным этапе рэформы школы : зб. навук. арт. / склад. А. І. Бельскі, М. Ф. Печанко. – Мінск : НІА, 2003. – 216 с.

6. *Ярыгина, Н.* Филологическая культура как показатель качества филологического образования / Н. Ярыгина [Электронный ресурс]. – 2001.28.10. – Режим доступа: http://www.relga.ru/Environ/WebObjects/tgu. www. woa/wa/Main?textid=402&level1=main&level2=articles. – Дата доступа : 10.03.12.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ